Беларусь.info

№65 02/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Галадоўнікаў наведалі прадстаўнікі АБСЭ, ініцыятара клічуць у пракуратуру.** Салігорскіх галадоўнікаў наведалі прадстаўнікі АБСЭ. Сёньня ж, 2 чэрвеня, адзін з ініцыятараў галадоўкі атрымаў позву ў пракуратуру.

**Эўразьвяз патрабуе спыніць перасьлед БХК.** Эўрапейскі Зьвяз выступіў у абарону Беларускага Хэльсынскага камітэту (БХК) і запатрабаваў ад уладаў неадкладна спыніць перасьлед гэтай арганізацыі, які, паводле Брусэлю, мае палітычны характар.

**Мэр польскага Беластоку адмовіўся паехаць у суседнюю Горадню,** дзе ў гэтыя выходныя адбудзецца Фэстываль нацыянальных культур, арганізаваны беларускімі ўладамі. Паводле прэсавага прадстаўніка мэра Беластоку Рышарда Тура Томаша Цьвікоўскага, калі браць пад увагу пазыцыю польскага ўраду што да сытуацыі ў Беларусі, дык “удзел мэра ў гэтым мерапрыемстве быў бы адыходам ад польскай замежнай палітыкі”, таму кіраўнік гораду адмовіўся ехаць у Горадню.

**Студэнты ЗША склалі пэтыцыю супраць парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі.** Студэнты амэрыканскай юрыдычнай школы Seton Hall University School of Law склалі пэтыцыю супраць парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі. Ініцыятарам пэтыцыі стаў выпускнік беларускага юрфака Яўген Вайткевіч.

# Людзі

**У моладзевай галадоўцы пратэсту бяруць удзел ужо 36 чалавек.** Пяты дзень працягваецца моладзевая галадоўка пратэсту з патрабаваньнем спыніць крымінальны перасьлед сяброў “Маладога фронту” і вызваліць усіх палітычных зьняволеных. У акцыі пратэсту бяруць удзел моладзевыя актывісты зь Менску, Салігорску, Горадні, Жодзіна, Ліды і ўкраінскага Луцку. Моладзевыя актывісты кажуць, што колькасьць удзельнікаў акцыі будзе павялічвацца.

**Палітзьняволены Цімафей Дранчук ведае сына толькі па фотаздымках.** У лістападзе 1959 года Генэральная Асамблея ААН прыняла Дэклярацыю аб правах дзіцяці. Прынцып нумар 6 гэтай Дэклярацыі прадугледжвае, што дзіцёнак павінен, калі гэта магчыма, расьці пад апекай і пад адказнасьцю сваіх бацькоў. Ніколі ня бачыў свайго бацьку двухмесячны Платон Дранчук – сын актывіста незарэгістраванай арганізацыі “Партнэрства” Цімафея Дранчука, які ўжо чацьвёрты месяц утрымліваецца ў турме КДБ “Амэрыканка”.

# Цытаты

**Первый заместитель министра обороны генерал-лейтенант Сергей Гурулев: У Беларуси нет такой близости с НАТО, какая должна быть.** Но я думаю, пройдет время, мы придем к тому, что это не совсем правильно. Мы должны развивать отношения.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org